Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (538) Субота, 12 кастрычніка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

## Малайцы, студэнты!

Рэктару БДУ імя У. І. Леніна

ВОДГУК АБ РАБОЦЕ СТУДЭНТАЎ

З вялікім задавальненнем паведамляем Вам, што студэнты, адкамандзіраваныя з Вашай навучальнай установы для ўдзелу ў будаўніцтве ў Акбулакскім зернесаўгасе Уральскай вобласці, праявілі сябе на рабоце вельмі добра.

Студэнцкі атрад, дзе камандзірам тав. САРОКІН М. І., паказаў высокую дысцыплінаванасць, арганізаванасць у працы.

Атрад тав. САРОКІНА М. І. дырэкцыя саўгаса прэміравала грашовымі прэміямі, пахвальнымі граматамі саўгаса, прадставіла да ўзнагароджання граматамі АК ЛКСМК, пахвальнымі лістамі РК ЛКСМК.

Дырэктар саўгаса ВЫРАЎШЧЫКАЎ.
Сакратар парткома КРАЎЦОЎ.
Сакратар камсамольскай арганізацыі БАЙДОСАЎ.
Старшыня рабочкома СЕЛІВАНАЎ.

## Сябра! Калі ёсць у цябе жаданне

Спачатку, калі я хацеў расказаць аб сваіх новых знаёмых, у мяне ўзнік нават план. Я яго запісаў на паперу. А калі ўзяўся за першы сказ, зразумеў, што мой план дарэмна састаўлены. Дай-ка, я лепш раскажу аб тым, што перажыў сам. Хоць коратка, хоць у некалькіх словах.

Падрыхтоўчыя курсы... Тэрмін набору ўжо канчаўся. Я падрыхтоўваў дакументы, вечарамі, прыйшоўшы з работы, шукаў патрэбныя кнігі, раіўся з... самім сабой. Ці правільна я раблю? Ці не пайсці мне ў інстытут, тэхнікум? Іх жа так многа ў Мінску, у Беларусі, у іншых рэспубліках. Неяк сустрэўся мне адзін мой знаёмы:

— Паступай у політэхнічны, Георгій. Ва ўсім дапамагу: я ж інжынерам працую. На «тройках» праедзеш. Запэўняю.

Але ў мяне ў душы — іншае. І ніхто аб гэтым не ведаў, нават бацькі.

...Першыя заняткі на падрыхтоўчых. Неяк шкада згубленага часу—пяць гадоў пасля дзесяцігодкі і дзесяцігадовы стаж работы. Але вялікае дзякуй універсітэцкім выкладчыкам і тым таварышам, з якімі я і цяпер займаюся. Цяжка прыходзілася. Нават вельмі. З працы—дамоў. Снедаў, не снедаў, а ўзяў сшыткі, ручку — і на заняткі. Прыйшоў дамоў, адпачыў і зноў за працу. А ледзь вольная хвіліна трапілася —у бібліятэку. Крыўдна часам было на душы: сябры ідуць у парк, у кіно, на праспект, а мне трэба на заняткі. Але

(Заканчэнне на 2 стар.)

## З пасяджэння бюро камітэта камсамола БДУ

Пазаўчора адбылося пасяджэнне бюро камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна. Сярод іншых пытанняў была разгледжана асабістая справа групы турыстаў — студэнтаў фізічнага факультэта. Вось што паведаміў камітэту камсамола Беларускі рэспубліканскі савет па турызму:

«У камітэт ЛКСМ Беларусі БДУ імя У. І. Леніна.

17 жніўня 1963 г. на Каука-

(Заканчэнне на 2 стар.)

## Па універсітэту

Закончыліся ўступныя экзамены на завочным аддзяленні па спецыяльнасцях журналістыка, філасофія і правазнаўства (асенні паток). Усяго сёлета прынята на завочныя аддзяленні 200 чалавек, з іх на аддзяленне філасофіі — 50, на аддзяленне журналістыкі — 50, на аддзяленне правазнаўства— 100 чалавек.

Адбыўся партыйны сход арганізацыі адміністратыўна-гаспадарчай часткі. Сход абмеркаваў пытанне аб падрыхтоўцы вучэбных карпусоў і студэнцкіх інтэрнатаў да зімовага перыяду.

Бібліятэка універсітэта арганізавала кніжна-ілюстратыўную выстаўку, прысвечаную 250-годдзю з дня нараджэння Дэні Дыдро.



У нашых сяброў

## Адэскія ВНУ—юбіляры

Некалькі дзён назад споўнілася 50 гадоў Адэскай кансерваторыі. Са сцен гэтай навучальнай установы выйшла нямала цудоўных дзеячоў мастацтваў. Тут, напрыклад, вучыліся сусветна вядомы скрыпач Д. Ойстрах і не менш вядомы піяніст Э. Гілельс, пачыналі свой творчы шлях вядомыя дырыжоры М. Паверман і І. Зак, над першымі кампазіцыямі працавалі К. Данькевіч і К. Карчмароў, раскрывалі свае таленты М. Грышко і Е. Чаўдар, Г. Алейнічэнка і Б. Рудэнка, З. Хрысціч і Г. Паліванава.

Шлях Адэскай кансерваторыі з часу яе заснавання вызначан смелым наватарствам выкладчыкаў і студэнтаў, барацьбой за мастацтва высокіх ідэй, імкненнем калектыву несці музычную культуру ў масы, рабіць яе здабыткам працоўных. Вось толькі на працягу мінулага года сіламі калектыву кансерваторыі дадзена звыш 200 канцэртаў для рабочых і калгаснікаў, праведзена вялікая работа па іх эстэтычнаму выхаванню. Навучальная установа стала не толькі школай сучаснага мастацтва — музыкантаў, кампазітараў, вакалістаў, дырыжораў, а і прапагандыстам музычнай культуры. Працоўныя не дарэмна шлюць кансерваторыі ў юбілейныя дні гарачыя прывітанні і пажаданні.

Гэтай жа восенню спаўняецца 45 гадоў Адэскаму політэхнічнаму інстытуту. Ён даў народнай гаспадарцы краіны кагорту выдатных інжынераў, якія працавалі і працуюць на самых разнастайных участках айчыннай прамысловасці. У сценах ВНУ праводзіцца вялікая навуковая работа, цесна звязаная з задачамі камуністычнага будаўніцтва. Адэскі політэхнічны інстытут заваяваў найлепшую рэпутацыю ў Саюзе як падрыхтаванымі тут кадрамі, так і адкрыццямі і вынаходніцтвамі, зробленымі яго вучонымі.

І яшчэ адна вышэйшая навучальная ўстанова Адэсы хутка спраўціць свой юбілей. У 1863 годзе было вырашана заснаваць у Адэсе універсітэт. Праз два гады яго дзверы адчыніліся перад першымі студэнтамі. Ва універсітэце імя выдатнага рускага бактэрыёлага І. Мечнікава цяпер ідзе дзейсная падрыхтоўка да знамянальнай даты. За сто гадоў ёсць што падлічыць. Яшчэ большыя перспектывы раскрываюцца перад ВНУ ў будучым.

Выкладчыкі і студэнты іншых ВНУ горача вітаюць калектывы адэскіх ВНУ — юбіляраў, жадаюць ім поспехаў у працы на блага Радзімы.

Г. ДЫМ.

(З газеты «Кадры будовам» Адэскага інжынерна-будаўнічага інстытута).

## Савецка-германская дружба—непарушная

Таварышы М. С. Хрушчоў і Л. І. Брэжнеў накіравалі кіраўнікам Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі таварышам Вальтэру Ульбрыхту, Ота Гротэвалю, Іяганесу Дзікману і Эрыху Корэнсу прывітальнае пасланне з выпадку 14-й гадавіны з дня ўтварэння рабоча-сялянскай дзяржавы.

Савецкі народ, гаворыцца ў пасланні, вітае працоўных Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якія ў цесным супрацоўніцтве з народамі сацыялістычных краін нястомна змагаюцца за захаванне і ўмацаванне міру ў Еўропе, за ліквідацыю рэшткаў другой сусветнай вайны і заключэнне германскага мірнага дагавору, супраць небяспечных рэваншысцкіх імкненняў заходнегерманскіх мілітарыстаў.

Як адзначаецца ў пасланні, ніякія прошукі заходнегерманскай і міжнароднай рэакцыі не могуць затрымаць працэсы развіцця і ўмацавання ГДР як суверэннай, незалежнай дзяржавы, умацавання яе міжнародных пазіцый і прэстыжу. ГДР цвёрда і ўпэўнена ідзе па выбранаму яе народам сацыялістычным шляху.

Мы з радасцю адзначаем, указваецца ў пасланні, што брацкія адносіны і ўсебаковае плённае супрацоўніцтва, што склаліся паміж нашымі краінамі і народамі, усё больш умацоўваюцца і пашыраюцца. Непарушная савецка-германская дружба стала дзейсным фактарам захавання міру і бяспекі ў Еўропе, залогам таго, што любыя экспансіяніцкія імкненні заходнегерманскага мілітарызму і рэваншызму супраць ГДР загадзя асуджаны на правал. У будаўніцтве сацыялізма, у абароне яго заваёў ад пасяганняў імперыялістычных сіл савецкі народ заўсёды будзе разам з вамі. Савецкі Саюз і ГДР у адзіным страі змагаюцца за далейшае ўмацаванне і згуртаванасць сусветнай сацыялістычнай садружнасці, за адзінства камуністычнага і рабочага руху.

(ТАСС).

* * *

Сёння мы прапануем вашай увазе яшчэ два здымкі, якія зрабіў у час паездкі на цаліну студэнт 4 курса фізічнага факультэта Тадэуш Пяркоўскі.

**На верхнім здымку:** студэнцкі палатачны гарадок будаўнікоў у саўгасе «Стэпавым» Уральскай вобласці.

**На ніжнім здымку:** працуе студэнцкая грамадская пральня.



# Сябра! Калі ёсць у цябе жаданне

Пачатак на 1 стар.)

скардзіцца, уласна кажучы, няма на каго. Як гаворыцца ў народзе: «Узяўся за гуж, не кажы, што не дуж»...

На першым паверсе ля дошкі аб'яў падрыхтоўчых курсаў стаіць група дзяўчын і юнакоў. Хлопцы ганарыста, праз галовы дзяўчын глядзяць у расклад заняткаў, а дзяўчыны нясмела шукаюць свае прозвішчы ў спісах прынятых на курсы.

І вось — першае знаёмства. Хлопец як хлопец. Адрэкамендаваўся: Працько Мікалай. На мотавелазаводзе ўжо цэлы год працуе токарам. Не асаблівага складу і хлопец, але рукі моцныя, голас упэўнены. І няхай не будзе здзіўляюча тое, што Мікалай рашыў пайсці вучыцца на юрыдычны факультэт. Юрысты ж павінны добра ведаць людзей, іх працу, з першага погляду складваць сабе ўяўленне аб чалавеку. І гэтаму як нельга лепш садзейнічае працоўны калектыў, у якім працуе Мікалай.

А вось і сапраўды непрадбачаная сітуацыя. Як і хто паднімае і грузіць на платформы самыя цяжкія мінскія аўтамашыны — МАЗы? Ну, канешне, маленькая, зграбная, з касічкай Аня Драбышэўская!

Адразу ж пасля заканчэння школы пайшла Аня вучыцца на курсы кранаўшчыкоў, а цяпер перaступіла парог універсітэта з адзінай думкай:

— Вельмі хацелася б стаць адвакатам.

Так, Аня, ты будзеш адвакатам. Трэба толькі вельмі жадаць гэтага.

А для Людмілы Ткачовай — машыністкі завода запасных частак — па душы мець справу з хіміяй.

— Я вельмі ўдзячна нашаму выкладчыку школьнаму Рабіновічу. Ён прымусіў нас так палюбіць гэты прадмет, што я аддаю перавагу менавіта яму.

Чытачы, зразумела, упершыню знаёмяцца і з Ларысай Фурманавай. Як медыцынская сястра 1-й клінічнай бальніцы яна вельмі чуллівы таварыш у калектыве.

— Сваю прафесію я не праменяю ні на якія іншыя. А працую я цяпер медсястрой пасля заканчэння Мінскага медвучылішча № 2. Толькі Вы, калі ласка, не здзіўляйцеся, што я мару займацца на біяфаку. Тут жа ёсць вялікая сувязь з медыцынай!

Мы ад душы верым Ларысе. І Людміле, і Ане, і Мікалаю. Яны прыйшлі ў БДУ імя У. І. Леніна з адзіным імкненнем, як і іх сябры па падрыхтоўчых курсах, вывучаць навуку, потым рабіць адкрыцці, ажыццяўляючы сваю цяперашнюю мару, цяперашняе жаданне.

Георгій ОГІЙ,
студэнт 3 курса вяч. аддз. журналістыкі



Сосны.

Фотаэцюд А. Градзюшкі.

## Стихи университетских поэтов

* * *

Не сказав и двух слов на прощанье,
Помнишь, детство, под шелест берёз
Ты растаяло, синее, раннее,
Словно утро... Мне горько до слёз.

Мы взрослели и крепли по-разному.
Мы неверных теряли подруг...
Это жизнь нас учила и ранила,
Словно чуткий, настойчивый друг.

Били ветры, морозные, трепкие,
Не сорвался ты, голос весны.
Мы — живучие, стойкие, крепкие.
Наши цели чисты и верны.

Это жизнь нас учила и ранила.
Оттого ты так громко звенишь,
Бесконечное, синее, раннее
Утро юности нашей, весны!

### Осенний день

День лучом разгорелся раскосым
В золотистых охапках берёз.
И рассыпались бисером росы
С расплетённых берёзовых кос.

Обошёл по-хозяйски болота,
Корчевал, зная хлебу цену.
И, смахнувши горошинки пота,
Запахал за рекой целину.

Мощной трелью раздался в бездонье,
В поле озимью дружной пророс.
А коснулся шершавой ладонью —
И листья облетели с берёз.

Подгребает сухие покосы,
То, любуясь работой, затих...
Осень, добрая, рыжая осень
Свежей строчкою сыплется в стих.

Мария ГРУША,
студентка 2 курса филфака.

## З пасяджэння бюро камітэта камсамола БДУ

(Пачатак на 1 стар.)

зе ў турысцкім паходзе загінуў студэнт БДУ Марахоўскі В. І. Гібель Марахоўскага з'явілася вынікам авантурыстычных дзеянняў групы турыстаў БДУ, якую ўзначальваў студэнт фізічнага факультэта, член ЛКСМБ, старшыня секцыі турызма БДУ Люцко А. М. Група Люцко, груба парушыўшы ўсе правілы арганізацыі турысцкіх падарожжаў (нідзе не зарэгістраваўшыся, без маршрутнага ліста, занядбаўшы меры бяспекі), ашукаўшы сваіх таварышаў-турыстаў, выйшла на небяспечны маршрут, які не адпавядае падрыхтаванасці групы. Нездаровыя абставіны скрытнасці, недастатковая фізічная і тэхнічная падрыхтоўка ўдзельнікаў і грубыя памылкі, дапушчаныя кіраўніком групы, прывялі да няшчаснага выпадку. Група Люцко і асабліва яе кіраўнік нясуць поўную адказнасць за здарыўшаеся.

Прэзідыум Беларускага рэспубліканскага савета па турызму абмеркаваў дзеянні групы Люцко і пазбавіў членаў групы усіх турысцкіх званняў.

Просім камсамольскую арганізацыю універсітэта абмеркаваць антыграмадскія паводзіны студэнтаў фізічнага факультэта БДУ Люцко А., Мамантавай В., Іўкавіча В., Берзіна В.

**Старшыня Беларускага рэспубліканскага савета па турызму П. БАГДАНАЎ».**

Бюро камітэта камсамола, падрабязна азнаёміўшыся з абставінамі справы, аб'явіла А. Люцко суровую вымову з занясеннем ва ўчотную картку, В. Мамантавай, В. Іўкавічу, В. Берзіну аб'яўлены вымовы.

*Куток сатыры і гумару*

## Тры сустрэчы з Язэпам Таранкай

(Нявыдуманая гісторыя з выдуманымі іменамі)

Я чакаў прыёма да тэрапеўта. Нас, хворых, было чалавек з дваццаць. Вядома, бульба! Хочаш, не хочаш — захварэеш. Адны чыталі, другія думалі аб нечым сваім, увабраўшы галаву ў плечы, трэція гутарылі, нават смяяліся — хворыя! Наслухаешся іхняй гамонкі, сапраўды, галава разбаліцца.

І раптам, не жадаючы таго, я стаў сведкай аднаго размовы.

— Ведаеце, дарагая, пішаш і пішаш. Няма табе спакою ні днём, ні ноччу... Нават у сне пішаш...

— Так Вы, пэўна, гісторык? Летапіс універсітэта пішаце. Так? — запыталася «дарагая».

— Н-н-нэ!—працадзіў скрозь зубы «летапісец».

— Юрыст?

«Пісар» адмоўна паківаў галавой.

— Філолаг?

— М-м-м-м, — замычэў ён.— М-да і нэ!

— Тады — журналіст?

— Але, — зноў працадзіў ён. —Зараз я заканчваю раман, пачаў пісаць аповесць, якую прысвячаю...

Ён не дагаварыў. У гэты момант з пакою тэрапеўта высунулася галава і паклікала:

— Язэп Таранка!

«Пісьменнік» падняўся, паправіў акуляры, зняважліва кіўнуў дзяўчыне і знік за дзвярыма...

А аднойчы я рашыў зайсці да знаёмай дзяўчыны ў 38 пакой. Але што гэта? Там крык, бегатня, лаянка. Дзверы маланкай адчыніліся і адтуль выскачыла адна дзяўчына, за ёй другая. Яны нават не заўважылі мяне. А за імі гусаком выйшаў — хто б вы думалі?— Язэп Таранка, чырвоны, як рак. Ён змерыў мяне позіркам сваіх «геніяльных» вачэй, папраівў скамечаны гальштук і пакрочыў па калідоры паходкай «марскога ваўка».

Я зайшоў у пакой, прывітаўся.

— Што тут у вас было?

Маўчанне.

— Ніна, скажы ты, калі ласка. Ну, растлумач. Ты ж смелая!

«Смелая» Ніна сказала:

— Ды зноў Таранка прыходзіў!..

— Ну і што?

— Што, што! Дурань ён, тупіца — вось што.

Такога я не чакаў.

— Нін, ты нешта блытаеш. Ён жа пісьменнік!

Усе пяць дзяўчын зарагаталі на ўвесь пакой. Я ніколі не гавары́ў нічога смешнага. Ад маіх слоў хутчэй можна плакаць. А тут пяць толькі што невясёлых дзяўчат смяюцца ад усёй душы. Няўжо з мяне? А дзяўчаты наперабой пачалі расказваць:

— Балбатун ён! Цану сабе набівае перад дзяўчатамі. Кожны дзень ходзіць з новай. Прыйшоў і да нас — спадабалася яму Ліда. Ён і кажа: «Абрыдлі мне гэтыя... з праспекта. Хачу нечага сапраўднага...».

Пэўна аплявухай прыйшоў ся яму адказ дзяўчыны, бо ён з хвіліну глядзеў на яе немігаючымі вачыма.

— Ты глядзі ў мяне! Я маю шайку. Скажу — і ўсё!..

Ён так шматзначна правёў рукой па сваёй глотцы, узняў вочы ўверх, што ў пакоі, здалося, запахла магілай, залёталі святыя анёлы.

Але і гэта не падзейнічала. Тады Таранка пусціў у ход рукі. Умяшаліся дзяўчаты. Але ў Язэпа рукі працавітыя. Сіла ў іх маладзецкая. Адлятаілі маладзічкі ва ўсе чатыры бакі свету, пакуль Лідзе не ўдалося вырвацца з яго рук і з пакою.

Пасля гэтага паядынку і пайшоў Язэп браць паперку, маўляў, хворы. Няма здароўечка! Асабліва бульбу капаць. Наконт таго, як узяць такую цыдульку (ён аб гэтым гаварыў па сакрэту дзяўчатам), Таранка ведае шаснаццаць спосабаў і распрацоўвае яшчэ дзесяць. І што вы думаеце — узяў!..

Мая трэцяя сустрэча з ім адбылася ў галоўным корпусе. Насустрач мне ішоў выкладчык літаратуры. І раптам бачу, абганяе мяне нехта з працягнутай рукой. Ба, ды гэта Таранка! Пятнаццаць крокаў прайшоў ён так. Я бачыў, як пачырванеў выкладчык, сорамна яму стала за такога студэнта. А Язэпу хоць бы што!

— Добры дзень, Васіль Андрэевіч!

І ледзь па плячы не хлопае выкладчыка...

Анекдоты ходзяць на курсе пра Язэпа Таранку. Сябры, сяброўкі гавораць:

— Кінь дурыць, Язэп! Жыві, як іншыя!

А ён цэдзіць скрозь зубы:

— Выганяць—пайду ў акадэмію мастацтваў. Зараз я працую над новай карцінай. Мяне ўжо запрашалі.

Можа, сапраўды, месца «таленавітага» Таранкі там. А можа і ў іншым месцы. Ён жа на ўсе рукі мастак!

Е. САЛАЎЁЎ.

## Студэнцкія прымаўкі

Зімовая сесія семестр корміць (і вясенняя таксама).

Прафесара баяцца — экзамена не здаць.

Сем дзён вучы — адзін дзень здавай (а не наадварот).

Лепш здаць позна, чым ніколі.

Душа выкладчыка —пацёмкі.

Лепш «тройка» ў залікоўцы, чым «пяцёрка» ў «праекце».

Чти декана своего.

(Са студэнцкіх газет).

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА

МІНСКАЕ ГАРАДСКОЕ АДДЗЯЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» І БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя У. І. ЛЕНІНА

арганізуюць цыкл лекцый

**„Буйнейшыя майстры рускага жывапісу XIX стагоддзя"**

15 кастрычніка — К. П. Брулаў.
29 кастрычніка — А. А. Іваноў.
12 лістапада — П. А. Фядотаў.
26 лістапада — В. Г. Пяроў.
10 снежня — І. Н. Крамской.
24 снежня — В. Е. Макоўскі, Н. А. Ярашэнка.
14 студзеня 1964 г. — Ф. А. Васільеў.
28 студзеня — І. І. Шышкін.
11 лютага — В. М. Васняцоў.
25 лютага — В. В. Верашчагін.
10 сакавіка — І. Я. Рэпін.
24 сакавіка — В. І. Сурыкаў.
7 красавіка — І. І. Левітан.
21 красавіка — В. А. Сяроў.
12 мая — М. А. Урубель.
26 мая — М. В. Несцераў

**Пачатак лекцый у 19 гадзін.**

Лекцыі чытаюць высокакваліфікаваныя лектары, навуковыя супрацоўнікі Дзяржаўнага Рускага музея г. Ленінграда. Лекцыі суправаджаюцца рэпрадукцыямі, ілюстрацыямі, кінафільмамі.

Абанементы і білеты можна набыць у сакратароў курсавых камсамольскіх арганізацый.

Кошт абанемента на цыкл лекцый — 2 рублі, кошт разавага білета — 20 капеек.

Тэлефоны для даведак: 2-06-25, 2-33-59, 2-45-37.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 05006. Тыр. 2000. Зак. 3685.